# КНІГА НАШАГА ЗЕМЛЯКА

Кнігарні Лепельшчыны, як і ўсей Беларусі, папоўніліся новым навуковым выданнем "Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі", аўтарам якога з'яўляецца наш зямляк—Рыгор Фёдаравіч Шаура. Кніга выйшла ў свет у самым канцы 1995 года. У ёй, акрамя тэкставага матэрыялу, змяшчаецца звыш 260 каляровых і чорна-белых ілюстрацый з карцін самадзейных мастакоў нашай рэспублікі. Манаграфія ахоплівае вялікі прамежак часу—з 1917 па 1988 год, дзе даследваецца творчасць непрафесіянальных майстроў жывапісу, графікі і скульптуры. У кнізе ўпершыню ўсебакова і поўна адлюстроўваецца дзейнасць мастакоў з народа, аналізуюцца асноўныя гістарычныя этапы развіцця самадзейнага мастацтва ў агульнай плыні мастацкай культуры нашай рэспублікі.

Аўтар выкарыстоўвае багаты архіўны матэрыял, літаратурныя крыніцы, дакументы музеяў Беларусі, дамоў народнай творчасці і дамоў мастацкай самадзейнасці, жывапісныя карціны, графічныя лісты і скульптурныя творы мастакоў. Рыгор Фёдаравіч збіраў матэрыял на працягу доўгага часу. Ён аб'ездзіў бадай што ўсю Беларусь, сустракаўся з дзесяткамі, сотнямі мастакоў, вывучаў іх творчасць, вёў фотатэку работ. Увесь такі матэрыял лёг у аснову гэтага выдання, якое атрымала добрыя водгукі ў прэсе і стала жаданай кнігай для аматараў

## Рэцэнзіі

мастацтва. У кнізе змешчаны грунтоўны матэрыял і аб творчасці нашых землякоў—Васіля Жарнасека і Рыгора Колчына, якія ўнеслі пэўны ўклад у развіццё духоўнай культуры рэспублікі.

З нагоды выхаду ў свет кнігі мы звязаліся па тэлефону з Рыгорам Фёдаравічам. Ён працуе ў Беларускім універсітэце культуры загадчыкам кафедры народных рамёстваў, з'яўляецца кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам, выдаў, акрамя апошняй, шэсць манаграфій па праблемах развіцця беларускага выяўленчага мастацтва. Р. Шаура член Саюза мастакоў Беларусі, творча працуе ў галіне акварэльнага жывапісу.

Рыгор Фёдаравіч з асаблівым цяплом успамінае сваю школу шасцідзесятых гадоў (Лепельская СШ № 2), дзе вучыўся, атрымаў атэстат і пайшоў, як кажуць, у людзі, успамінае сваіх настаўнікаў, што выхоўвалі ў вучнях разумнае, добрае, светлае, зычылі поспехаў у далейшым самастойным жыцці. У рэдкія гадзіны, калі з'яўляецца магчымасць наведаць родныя куткі, Рыгор Фёдаравіч імкнецца пахадзіць па вуліцах нашага горада, настальгічна адчуць тое далёкае па часе, але душэўнае і блізкае, што звязана з яго школьнымі гадамі, юнацтвам.

Мінула ўжо звыш трох дзесяцігоддзяў, калі разышліся шляхі аднакласнікаў, кожны з іх, напэўна, знайшоў сваю дарогу ў жыцці. Рыгор Фёдаравіч трывала крочыць па навукова-творчаму шляху. І нам хацелася б пажадаць яму новых поспехаў і здзяйсненняў. Мы чакаем ад яго новых кніг, новых выданняў і будзем ганарыцца сваім земляком.

**Калектыў рэдакцыі газеты "Лепельскі край".**